# Дзень роднай мовы па-сталічнаму

***Штогод 21 лютага ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. У гэты дзень у розных гарадах Беларусі больш гучала беларускай мовы пад час разнастайных тэматычных мерапрыемстваў. Распавядзем, што адбывалася ў Мінску.***

**20 лютага** ў філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь «Дом-музей I з'езда РСДРП» адбылася **імпрэза «Слова як памяць»**, прысвечаная прэзентацыі «Расейска-беларускага слоўніка» гісторыка і педагога Апанаса Ярушэвіча (1867 – 1918/1924). Імпрэза падрыхтаваная сумесна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У межах падрыхтаванай да Міжнароднага дня роднай мовы **літаратурна-адукацыйнай праграмы «Разнамоўны дзіўны свет»** у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі 20 лютага адбылася сустрэча з вучнямі адной з мінскіх школаў. Для дзяцей і падлеткаў была арганізаваная цікавая праграма з інтэлектуальнымі і лінгвістычнымі гульнямі, конкурсамі, віктарынай, гучнымі чытаннямі. Працавала інтэрактыўная кніжная выстаўка «Чытаем сусветную класіку па-беларуску» – шэдэўры літаратурнай класікі ў перакладах на беларускую мову.

**21 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі Дзень роднай мовы ўрачыста адзначылі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (старшыня Уладзімір Макей). Замежныя паслы кожны на сваёй роднай мове прачыталі некалькі параграфаў Канстытуцыі краіны, якую прадстаўляюць у Беларусі.

**21 лютага** «Арт Сядзіба», Саюз беларускіх пісьменнікаў, кампанія «Будзьма беларусамі!», ПЭН-цэнтр, Белсат і платформа падтрымкі жывой беларускай мовы ў сферы абслугоўвання say.by запрашалі на канцэрт у межах кампаніі **«Беларускамоўны»**. Выступілі беларускія паэты і музыкі, сярод якіх гурт Akute, рэпер ANGST, Усевалад Сцебуракā, Стась Карпаў ды іншыя. Каманда say.by прэзентавала новую версію мабільнага дадатку для размоваў па-беларуску ў сферы абслугоўвання і штодзённым жыцці. Госці свята маглі паўдзельнічаць у квэстах з ужываннем дадатку, а самыя актыўныя атрымалі цікавыя прызы і падарункі.

**21 лютага** ранкам і ўвечары на будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі з'явіліся **спрадвечныя беларускія словы, аб'яднаныя выслоўем Якуба Коласа «Слоў не крышыць ні век, ні тапор»**. На вонкавым электронным светлавым табло бібліятэкі можна было ўбачыць не толькі традыцыйныя цытаты класікаў нацыянальнай літаратуры пра беларускую мову, але і словы, якія адрозніваюць нас ад іншых народаў.

**21 лютага** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрашаў далучыцца да **музейнай акцыі «Дзясятка – за Коласа!»**.

За некалькі месяцаў да смерці паэт напісаў свой знакаміты ліст-заклік аб крытычным стане беларускай мовы, радкі якога і па сённяшні дзень з'яўляюцца актуальнымі: «Найвялікшым духоўным багаццем народа з'яўляецца яго мова. У мове адлюстроўвалася гісторыя народа, яго працоўнае жыццё, яго барацьба, яго смутак і радасць, яго прырода, яго любоў і гнеў». Удзельнікі акцыі атрымалі магчымасць праверыць свае веды па жыцці і творчасці Якуба Коласа, а таксама па беларускай мове і літаратуры ў інтэрактыўнай гульні-віктарыне «Куфэрак скарбаў роднай мовы». Тыя, хто напісаў дыктоўку на дзесяць балаў і правільна назваў твор Якуба Коласа, атрымалі падзякі і памятныя сувеніры.





Уладзімір Макей


Чытанне Канстытуцыі Венесуэлы


Чытанне Канстытуцыі Грузіі


Чытанне Канстытуцыі Індыі

*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*